ДУК «КАРЭЛІЦКАЯ РАЁННАЯ БІБЛІЯТЭКА»

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Знамянальныя і памятныя даты краязнаўчага календара на 2025 год



Карэлічы, 2024

## *Прадмова*

Краязнаўчы каляндар на 2025 год падрыхтаваны на аснове “Спісаў знакамітых людзей Карэліцкага раёна”, даных архіва Карэліцкага ЗАГСа, краязнаўчай картатэкі Карэліцкай  раённай бібліятэкі, фонда Карэліцкага раённага краязнаўчага музея і іншых крыніц.

Адбор юбілейных дат рабіўся ў адпаведнасці са значнасцю для гісторыі, эканомікі і культуры краю.

Дадзенае выданне дапаможа супрацоўнікам бібліятэк і клубаў раёна, музеям у арганізацыі работы, а таксама будзе карысна краязнаўцам і шырокаму колу чытачоў.

*У 2025 годзе спаўняецца:*

**630 гадоў** з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах г.п. Карэлічы, цэнтра раёна (1395 г. ці 1434 г.).

**630 гадоў** з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах г.п. Мір Карэліцкага раёна (1395 г. ці 1434 г.).

**445 гадоў** з дня нараджэння **Маскевіча Самуіла Іванавіча** (1580 г., в. Сэрвач Карэліцкага раёна – 1642 г.), пісьменніка-мемуарыста, грамадскага і ваеннага дзеяча ВКЛ. У 1617-1618 гг. – дэпутат трыбунальнага суда ад Навагрудскага павета. Пасля 1632-1638 гг. – навагрудскі падваявода.

**400 гадоў** з дня нараджэння **Маскевіча Багуслава Казіміра** (1625 г., в. Сэрвач Карэліцкага раёна – 1683 г.), беларускага грамадскага дзеяча, пісьменніка-мемуарыста. Адукацыю атрымаў у Навагрудку.

**130 гадоў** з дня нараджэння **Логіна Язэпа Калістратавіча** (1895 г., в. Моладава Карэліцкага раёна – 1931 г.), беларускага фальклярыста, збіральніка твораў народнай паэзіі, беларускіх народных песень. Скончыў Навагрудскае павятовае вучылішча.

**120 гадоў** таму назад на Карэліччыне адбываліся масавыя сялянскія выступленні (1905–1907 гг.).

**85 гадоў** з часу заснавання Карэліцкай раённай бальніцы (1940 г.).

**80 гадоў** з часу заснавання Мірскай гарпасялковай бібліятэкі структурнага падраздзялення ДУК "Карэліцкая раённая бібліятэка" (1945 г.).

**230 гадоў** таму (1795 г.) Карэлічы ў выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай увайшлі ў склад Расійскай імперыі.

***Студзень***



01.01. – **80 гадоў** з дня нараджэння **Іпатавай Вольгі Міхайлаўны** (нар. у 1945 г., г.п. Мір Карэліцкага раёна), беларускай пісьменніцы (празаік, паэтка, драматург, літаратурны

крытык, публіцыст, перакладчык), грамацкага дзеяча, кавалера ордэна “Знак Пашаны”. У 1965-1968 гг. працавала ў Гродзенскім гаркаме ЛКСМБ. У 1968-1970 гг. – рэдактар Гродзенскай абласной студыі тэлебачання.

12.01. – **80 гадоў** з дня нараджэння **Башко Пятра Кузьміча** (1945 г., в. Некрашэвічы Карэліцкага раёна – 1993 г.), беларускага гісторыка.



12.01. – **115 гадоў** з дня нараджэння **Калошы Вольгі Лукінічны** (1910 г., г. Адэса – 2000 г.). Жыла і працавала ў в. Лукі Карэліцкага раёна. Перадавік сельскагаспадарчай вытворчасці, Герой Сацыялістычнай Працы (1965 г.). З 1948 г. палявод калгаса “Сцяг Леніна”, у 1954-1969 гг. звеннявая льнаводчага звяна. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 6-га склікання. Узнагароджана ордэнам Леніна.

21.01. – **85 гадоў** з дня нараджэння **Драко Аляксандра Уладзіміравіча** (нар. ў 1940 г., в. Застадолле Карэліцкага раёна), беларускага юрыста. Служыў саветнікам у Афганістане. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

***Люты***



10.02. – **85 гадоў** з дня нараджэння **Вадап’янава Паўла Аляксандравіча** (нар. у 1940 г., в. Паланая Карэліцкага раёна), беларускага філосафа, эколага, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара філасофскіх навук, прафесара, выдатніка адукацыі Беларусі, лаўрэата прэміі акадэмі навук Украіны, Беларусі і Малдовы (1996 г.).

15.02. – **125 гадоў** з дня нараджэння **Вільчыцкага Алеся** (Аляксандр Сцяпанавіч) (1900 г., г.п. Мір Карэліцкага раёна – 1938 г.), беларускага дзеяча культуры, педагога, рэдактара газеты “Беларуская справа” (Вільня, 1926 г.).



27.02. – **65 гадоў** з дня нараджэння **Петрушкевіч Алы Мікалаеўны** (псеўд. Альжбета Кеда) (нар. у 1960 г., в. Шчонава Карэліцкага раёна), беларускай пісьменніцы, літаратуразнаўца, крытыка, педагога, лаўрэата прэміі імя А.І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама “За творчыя дасягненні ў галіне літаратуры і мастацтва” ў намінацыі “Пісьменнік года” (1999 г.). Настаўнічала ў

Карэліцкім і Шчучынскім раёнах. З 1992 г. працавала ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Я.Купалы.

### *Сакавік*



08.03. – **115 гадоў** з дня нараджэння **Конюха Пятра Васільевіча** (нар. у 1910 г., в. Турэц Карэліцкага раёна – 1994 г.), беларускага опернага спевака (бас), музычнага педагога, дзеяча эміграцыі.

08.03. – **95 гадоў** з дня нараджэння **Карповіч Марыі Мікалаеўны** (1930 г., в. Палужжа Карэліцкага раёна – 2017 г.), работніка сельскай гаспадаркі, Героя Сацыялістычнай Працы (1966 г.). У 1955-1986 гг. – галоўны аграном калгаса "Звязда" Навагрудскага раёна. Узнагароджана ордэнам Леніна.

### *Красавік*



06.04. – **115 гадоў** з дня нараджэння **Кіта Барыса Уладзіміравіча** (1910 – 2018 гг.), вучонага ў галіне астранаўтыкі, матэматыка, фізіка, хіміка, акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, удзельніка нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, дзеяча беларускай эміграцыі ў ЗША. З 1918 г. жыў ў в. Агароднікі Карэліцкага раёна. Скончыў народную школу ў Карэлічах, Навагрудскую беларускую гімназію, у якой з 1939 г. працаваў дырэктарам. Арганізаваў шэраг беларускіх школ у Заходняй Беларусі.



09.04. – **75 гадоў** з дня нараджэння **Громака Валерыя Іванавіча** (нар. у 1950 г., г.п. Мір Карэліцкага раёна), беларускага матэматыка, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара.

### *Май*



17.05. – **130 гадоў** з дня нараджэння **Адлера Шауля Аарона** (нар. у 1895 г., г.п. Карэлічы – 1966 г.), ізраільскага вучонага ў галіне паразіталогіі і трапічнай

медыцыны, прафесара, кавалера ордэна Брытанскай імперыі. З 1928 г. працаваў прафесарам і дырэктарам Інстытута паразіталогіі пры Яўрэйскім універсітэце ў Іерусаліме.



27.05. – **125 гадоў** з дня нараджэння **Жылкі Уладзіміра Адамавіча** (1900 г., в. Макашы Нясвіжскага раёна, Мінскай вобласці – 1933 г.), беларускага паэта, перакладчыка, крытыка, публіцыста. У 1914 г. скончыў гарадское вучылішча ў г.п. Мір Карэліцкага раёна.

***Чэрвень***



05.06. **– 155 гадоў** з дня нараджэння **Лазінскага Зыгмунта** (1870 г., в. Барацін Карэліцкага раёна – 1932 г.), польскага і беларускага грамадска-культурнага дзеяча, рымска-каталіцкага царкоўнага дзеяча, біскупа Мінскага і Пінскага.



25.06. **– 145 гадоў** з дня нараджэння **Барысевіча Аляксея Іванавіча** (1880 г., в. Саленікі Карэліцкага раёна – 1953 г.), беларускага вынаходніка-самавука, які ўдзельнічаў у вырабе першых (залатых) зорак Крамля ў Маскве, стаханаўца, Героя Працы (1934 г.). Працаваў у Цэнтральным аэрагідрадынамічным інстытуце імя М.Я. Жукоўскага ў Маскве.

***Ліпень***



11.07. **– 100 гадоў** з дня нараджэння **Богуша Андрэя Аляксандравіча** (нар. у 1925 г., г.п. Карэлічы – 2009 г.), беларускага вучонага ў галіне тэарэтычнай фізікі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР.

***Жнівень***

01.08. **– 95 гадоў** з дня нараджэння **Кур'янкі Мікалая Іванавіча** (нар. у 1930 г., в. Турэц Карэліцкага раёна), беларускага лінгвіста, псіхолага, педагога.

13.08. **– 90 гадоў** з дня нараджэння **Забаўскага Міхаіла Цімафеевіча** (нар. у 1935 г., в. Турэц Карэліцкага раёна), беларускага вучонага ў галіне тэхналогіі машынабудавання, заслужанага работніка прамысловасці Беларусі.



17.08. **– 70 гадоў** з дня нараджэння **Яцэвіча Мікалая Аляксандравіча** (нар. у 1955 г., в. Сімакава Карэліцкага раёна), беларускага бібліятэказнаўца, педагога.



25.08. **– 80 гадоў** з дня нараджэння **Рахманько Яўгена Міхайлавіча** (нар. у 1945 г., в. Заполле Карэліцкага раёна – 2018 г.), беларускага хіміка-аналітыка, доктара хімічных навук, прафесара.

***Верасень***



14.09. **– 90 гадоў** з дня нараджэння беларускага вучонага ў галіне будаўніцтва аўтамабільных дарог, прамысловага транспарту, доктара тэхнічных навук, прафесара, заслужанага работніка адукацыі Беларусі **Вырко Мікалая Паўлавіча** (нар. у 1935 г., в. Краснае Карэліцкага раёна – 2018 г.).



15.09. **– 95 гадоў** з дня нараджэння **Богуша Аляксандра Уладзіміравіча** (1930 г., в. Вялікая Мядзвядка Карэліцкага раёна – 2018 г.), беларускага журналіста, краязнаўца, заслужанага работніка культуры Беларусі. У 1964-1969 гг. працаваў рэдактарам лідскай раённай газеты “Уперад”. З 1971 г. – галоўным рэдактарам абласной газеты “Гродзенская праўда”. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам “Знак Пашаны”.



17.09. **– 105 гадоў** з дня нараджэння **Крамко Яўгена Ігнатавіча** (нар. у 1920 г., в. Беражна Карэліцкага раёна – 1999 г.), беларускага пісьменніка (празаік, публіцыст).



30.09. **– 85 гадоў** з дня нараджэння **Бусько Міколы** (Мікалай Іосіфавіч; нар. у 1940 г., в. Пагарэлка Карэліцкага раёна – 2023 г.), беларускага пісьменніка (паэт, публіцыст,

перакладчык), мастака, краязнаўца, лаўрэата літаратурнай прэміі імя У. Калесніка (2013). Скончыў СШ у в. Турэц.

***Кастрычнік***

20.10. **– 120 гадоў** з дня нараджэння **Кучынскага Эдуарда** (нар. у 1905 г., в. Варонча Карэліцкага раёна – 1958 г.), беларускага і польскага мастака-графіка, мастацкага педагога.



25.10. **– 100 гадоў** з дня нараджэння **Мірачыцкага Льва Паўлавіча** (нар. у 1925 г., в. Баяры Карэліцкага раёна – 2002 г.), беларускага гісторыка-славіста, культуролага, публіцыста, літаратара.

***Лістапад***

25.11. – **85 гадоў** з часу ўтварэння **Карэліцкага раёна** (1940 г.).



28.11. – **105 гадоў** з дня нараджэння **Карачан Евы Раманаўны** (нар. у 1920 г., в. Вірышча Карэліцкага раёна – 2000 г.), работніка сельскай гаспадаркі, ільнавода, Героя Сацыялістычнай працы (1958 г.). У 1947-1976 гг. працавала ў калгасе “Новае жыццё” Карэліцкага раёна. Узнагароджана ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

***Снежань***



**320 гадоў** назад **Пётр I наведаў Карэлічы** (21 снежня 1705 г.).



**25 гадоў** з часу ўключэння **“Замкавага комплексу “Мір”** у Спіс Сусветнай культурнай спадчыны ЮНЭСКА (2000 г.).

**Складальнік:** А.У. Макарчык
**Рэдактар:** Л.К. Арцюх

ДУК “Карэліцкая раённая бібліятэка”
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

231430 Гродзенская вобласць, г.п.Карэлічы, вул. 17 Верасня, 8

**e-mail: cbib@korelichi-cls.by**
**grkr_market@mail.grodno.by**
**сайт: http//korelichi-cls.by**